# З ПІРАГАМІ І ГАРБАТАЙ

Смачна, весела і цікава падвялі вынікі палявых практык на біялагічным факультэце нашага ўніверсітэта. Да гэтага святочнага мерапрыемства былі падрыхтаваны: выстава прадукцыі, якую студэнты і выкладчыкі вырасцілі на сваіх прысядзібных участках, фотавыстава, дзе многія студэнты маглі ўбачыць сябе ў розных ракурсах падчас працы на зямлі, а таксама цудоўныя прысмакі і травяная гарбата, якімі прысутных частаваў загадчык кафедры батанікі, кандыдат біялагічных навук, дацэнт Леанард Міхайлавіч Мяржвінскі.

– Я віншую вас з тым, што сёння мы працягваем тыя традыцыі, якімі славіцца кафедра батанікі. Гэтым летам нашы студэнты працавалі на аграбіястанцыі ва Уланавічах, на сваіх прысядзібных участках, дзе вырошчвалі розныя культуры. А таму цяпер мы не толькі адзначым тых, хто прайшоў палявыя практыкі «на выдатна», але і паспрабуем «нагаворнае зелле» ад траўніка Леанарда, а таксама хатнюю выпечку ад студэнтаў і выкладчыкаў, – адзначыў Леанард Міхайлавіч.



Падзякі лепшым туркменскім студэнтам уручыла кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры батанікі Іна Міхайлаўна Марозава. Таксама ў прысутных была магчымасць прыняць удзел у займальнай віктарыне і атрымаць цукерку за правільна адгаданыя расліны на фотаздымках.

**Вікторыя ЧАКУШКА.**
**Фота Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**